# ЗАСЛУЖАНЫ АМАТАРСКІ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ УЗОРНЫ ХАРЭАГРАФІЧНЫ АНСАМБЛЬ "ЗОРЬКА"

## Цэнтра культуры "Віцебск"

Кіраўніком Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь узорнага харэаграфічнага ансамбля "Зорька" на працягу больш за 35 гадоў з'яўляецца заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь Чарнюк Наталля Аляксандраўна. У 1983 годзе калектыву было прысвоена найменне "ўзорны", а ў 2005-м – званне "заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь".

Усе канцэртныя і тэматычныя праграмы пад кіраўніцтвам Наталлі Аляксандраўны ўражваюць разнастайнасцю сваіх танцавальных нумароў, арыгінальнасцю харэаграфіі, прафесіяналізмам выканання. Сведчанне таму – вялізны поспех сярод гледачоў Беларусі, Расіі і краін Еўропы. Як кіраўнік, яна шмат робіць для папулярызацыі народнага танца, працуе над новымі фальклорнымі нумарамі, заснаванымі на мясцовым матэрыяле.

Сёння ў ансамблі займаецца 130 чалавек, якія размеркаваны па 3 узроставых групах: малодшая, сярэдняя і старэйшая. Пры ансамблі працуюць харэаграфічныя калектывы "Сонейка" і "Светлячок", у якіх займаюцца 110 дзяцей ва ўзросце ад 6 да 9 год.

За больш чым 50-гадовую дзейнасць ансамбль "Зорька" стаў своеасаблівым брэндам Віцебшчыны і атрымаў шырокую вядомасць у Рэспубліцы Беларусь і за яе межамі. У рэпертуары ансамбля – больш за 60 харэаграфічных пастановак і кампазіцый.

Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь узорны харэаграфічны ансамбль "Зорька" – пастаянны ўдзельнік шматлікіх абласных і гарадскіх мерапрыемстваў, часты ўдзельнік рэспубліканскіх акцый і канцэртаў (налічвае больш за 60 выступленняў у год). Так, ансамбль прымаў удзел у канцэрце, прысвечаным уручэнню прэміі "За духоўнае адраджэнне" (г. Мінск); Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (г. Мінск, г. Віцебск), Дню беларускага пісьменства (г. Глыбокае); мерапрыемствах, прысвечаных Дню Перамогі (г. Мінск, г. Віцебск); праекце II Нацыянальнага тэлеканала Рэспублікі Беларусь "АНТ" – "Флэш-моб да Дня Незалежнасці"; Міжнароднай канферэнцыі "Арт Лімуд Бела-

русь"; адкрыцці спаборніцтваў па мастацкай гімнастыцы і Міжнародных спаборніцтваў па гімнастыцы; абласных фестывалях-кірмашах працаўнікаў вёскі "Дажынкі" (г. Гарадок, г. Лёзна, г. Талачын); мерапрыемствах карпаратыўнага фестывалю самадзейных творчых калектываў і выканаўцаў даччыных таварыстваў і арганізацый ААТ "Газпром" "Факел" і шматлікіх іншых. У чэрвені 2016 года калектыў прымаў удзел ва ўрачыстым вечары "Наш шлях", прысвечаным V Усебеларускаму сходу (г. Мінск, Беларусь). На працягу шматлікіх гадоў ансамбль "Зорька" з'яўляецца пастаянным удзельнікам урачыстай цырымоніі і канцэрта, прысвечаных ушанаванню лаўрэатаў звання "Чалавек года Віцебшчыны".

Трэба адзначыць, што кіраўнік ансамбля Чарнюк Наталля Аляксандраўна ў 2009 годзе атрымала званне "Чалавек года Віцебшчыны – 2008" у намінацыі "Культура і мастацтва". Таксама мастацкаму кіраўніку ансамбля была прысуджана Дзяржаўная стыпендыя па падтрымцы дзеячаў культуры і мастацтва ў галіне самадзейнай мастацкай творчасці.

Па выніках 2011 года калектыву прысуджана прэмія Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "За духоўнае адраджэнне".

Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь узорны харэаграфічны ансамбль "Зорька" актыўна бярэ ўдзел у шматлікіх праектах ДУ "Цэнтр культуры "Віцебск". З 1991 года ансамбль прымае ўдзел у мерапрыемствах Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску": урачыстых адкрыцці і закрыцці фестывалю, канцэртах Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу "Віцебск" і іншых. Ансамбль "Зорька" ужо амаль 30 гадоў (з 1987 года) удзельнічае у арганізацыі і правядзенні Міжнароднага фестывалю сучаснай харэаграфіі ў Віцебску: удзельнікі калектыву працуюць куратарамі гасцей фестывалю, наведваюць майстар-класы.

Ансамбль "Зорька" актыўна выступае на разнастайных конкурсах і фестывалях і выходзіць на пляцоўкі не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі: калектыў неаднаразова запрашалі ў Германію, Грэцыю, Грузію, Італію, Латвію, Літву, Польшчу, Расію, Славенію, Украіну.

У 2012 годзе ансамбль быў запрошаны ў якасці госця на Міжнародны фестываль дзіцячага танца "В колі друзів", прысвечаны 50-годдзю ансамбля "Счастливое детство" (г. Харкаў, Украіна). У гэтым жа годзе ансамбль удзельнічаў у Міжнародным фестывалі дзіцячага танца "Весняні барві" (г. Харкаў, Украіна).

У 2012 годзе кіраўнік калектыву Чарнюк Н.А. атрымала высокую ўрадавую ўзнагароду – медаль Францыска Скарыны. Гэта сведчыць пра яе асабісты ўклад у развіццё беларускай школы харэаграфіі і самаадданай, мэтанакіраванай працы на карысць нацыянальнай культуры. А сам ансамбль атрымаў Спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва "За духоўнае адраджэнне".

2013 і 2018 годы былі адзначаны ўдзелам калектыву ў фестывалі Саюзнай дзяржавы "Творчасць юных" (г. Анапа, Расія), дзе "Зорька" атрымала дыплом "За прафесіяналізм у трактоўцы выканання твора". На VIII Міжнародным фестывалі юных талентаў "Зямля пад белымі крыламі" (г. Мазыр, Беларусь) ансамбль стаў уладальнікам дыплома I ступені. У гэтым жа годзе калектыў прымаў удзел у VIII Міжнародным фестывалі "Моладзь – за Саюзную дзяржаву" (г. Растоў-на-Доне, Расія).

У 2014 годзе ансамбль "Зорька" атрымаў дыплом II ступені на XIV Міжнародным фестывалі дзіцячай творчасці "Залатая пчолка" (г. Клімавічы, Беларусь), а на Міжнародным фестывалі "Містэрыя Dance" (г. Халкідзікі, Грэцыя) стаў уладальнікам Гран-пры.

У 2016 годзе ўдзельнікі Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь узорнага харэаграфічнага ансамбля "Зорька" прымалі ўдзел у Рэспубліканскім конкурсе харэаграфічнай творчасці "Юныя таленты Беларусі" (НДАЦ "Зубраня", Беларусь), дзе атрымалі два Гран-пры, два дыпломы I ступені ў намінацыях "Народна-сцэнічны танец" і "Эстрадны танец".

У лістападзе гэтага ж года ансамбль "Зорька" ўдзельнічаў у VII Абласным аглядзе-конкурсе харэаграфічных калектываў "Прыдзвінскія карункі", прысвечаным заслужанаму дзеячу культуры Беларусі І.А. Серыкаву, дзе атрымаў дыплом лаўрэата II ступені ў намінацыі "Лепшае выкананне аўтарскіх танцаў заслужанага дзеяча культуры Беларусі І.А. Серыкава (сярод дзіцячых калектываў)".

У 2017 годзе Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь узорны ансамбль танца "Зорька" прымаў удзел у Міжнародным фестывалі дзіцячай і моладзевай творчасці "Art-Panorama Baltika", які праходзіў у Латвіі і Швецыі. Ансамбль атрымаў тры Гран-пры ў намінацыі "Харэаграфічнае мастацтва" ў трох узроставых групах: малодшай, сярэдняй і старэйшай.

Добрыя адносіны ўсталяваліся ў ансамбля "Зорька" з Нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтрам "Зубраня". Амаль кожны год калектыў запрашаецца на розныя мерапрыемствы цэнтра. У справаздачны перыяд ансамбль удзельнічаў у святочным канцэрце "Сяброўства без межаў", прысвечаным Дню моладзі, які праводзіўся ў межах XII Міжнароднага маладзёжнага форуму; "Са стагоддзя ў стагоддзе крочым разам", прысвечаным Дню Саюзнай Дзяржавы і іншых. Таксама ў 2013 годзе ансамбль "Зорька" ўдзельнічаў у мерапрыемствах у дзіцячым спартыўным лагеры "Александрыя" (г. Салонікі, Грэцыя). У маі–чэрвені 2015 года ўдзельнікі Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь узорнага харэаграфічнага ансамбля "Зорька" прымалі ўдзел у юбілейнай змене "З днём нараджэння, Артэк!" у Федэральнай дзяржаўнай бюджэтнай установе "Міжнародны дзіцячы цэнтр "Артэк", дзе былі адзінымі прадстаўнікамі Беларусі, у 2018 годзе – у Міжнародным фестывалі "АРТ-PANORAMA" (Швецыя)".

На I Міжнародным фестывалі дзіцячай і юнацкай творчасці "Art-Panorama Poland" (2018 год) калектыў заваяваў Гран-пры. У 2019 годзе калектыў стаў уладальнікам дыплома лаўрэата I ступені конкурсу "Адкрытая Еўропа" (г. Масква) і ўладальнікам Гран-пры конкурсу ў Албене (Балгарыя).

"Зорька" – гэта не толькі выдатны творчы калектыў танцораў, гэта калектыў, які складаецца з саміх удзельнікаў, іх бацькоў, а таксама бабуль і  дзядуль. Выпускнікі калектыву працуюць харэографамі ў Ізраілі, Дубаі, Велікабрытаніі, Кітаі, Італіі, Турцыі, у Беларусі – выпускнік Дзмітрый Залескі – педагог, харэограф, пастаноўшчык і рэжысёр многіх канцэртаў і тэлевізійных праектаў, выкладчык Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, харэорграф майстэрні народнага артыста СССР і Расіі Уладзіміра Васільева. Таксама з "Зорькі" выйшла Вольга Скварцова – беларуская акторка і харэограф, ураджэнка Віцебска, галоўны балетмайстар Беларускага дзяржаўнага маладзёжнага тэатра. стваральнік праекта Skvo's Dance Company.

У 2019 годзе кіраўніку калектыву было прысвоена  ганаровае званне "заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь".